**МЕЙЛЕР (Mailer) Норман (н. 31.1.1923, г. Лонг-Бранч, штат Нью-Джэрсі, ЗША)**, амерыканскі пісьменнік і публіцыст. Скончыў Гарвардокі ун-т. Першы антываен. раман «Голыя 1 мёртвыя» (1948) напісаны ў традыцыях сац. рэаліст. рамана. У раманах «Бераг варвараў» (1951), «Парк аленяў» (1955), «Чаму мы ў В'етнаме?» (1967), сац.-крытычныя матывы, у рамане «Амерыканская мара» (1965) уплыў філасофіі экзістэнцыялізму. Канфлікт паміж асобай і грамадствам у цэнтры «дакументальнага рамана» «Песня кіта» (1979). Лепшыя кнігі М.-публіцыста — «Арміі ночы» 1 «Маямі і аблога Чыкага» (абедзве 1968) пра апазіц. рух у ЗША У канцы 1960-х г. Аўтар раманаў «Старадаўнія вечары» (1983), «Сапраўдныя хлопцы не танцуюць» (1984), «Змена варты» (1989), КН1Г «Мэрылін» (1973) 1 «Пра жаноцкую вытанчанасць» (1980; пра М.Манро).
Т. Я Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ